# § 18. Каланізацыя Паўночнай Амерыкі

**Успомніце.** *Якія еўрапейскія дзяржавы пачалі каланізацыю Паўночнай Амерыкі?*

Каланізацыя (ад лац. *colonia* — паселішча) — з’ява, шырока распаўсюджаная ў гісторыі. У старажытныя часы грэкі засялілі Прычарнамор’е і стварылі там свае паселішчы (калоніі).

**Вы даведаецеся.** *Чаму еўрапейскія перасяленцы імкнуліся да жыцця на нядаўна адкрытым кантыненце. Як склалася іх жыццё на новых землях.*

**1. Пачатак каланізацыі.** У 1607 г. тры караблі сталі на якар у вусці невядомай ракі на атлантычным узбярэжжы Паўночнай Амерыкі. На бераг сышлі першыя перасяленцы з Англіі. Іх было няшмат — каля 100 чалавек. Людзі ўбачылі цудоўныя лугі, прыгожыя высокія дрэвы і чыстыя воды, якія прывялі іх у захапленне. Усё зачароўвала еўрапейцаў: суніцы, у чатыры разы буйнейшыя за англійскія, далікатныя на смак вустрыцы, велізарныя асятры, нябачаныя плады і ягады.

Перасяленцы пабудавалі форт (умацаванне), царкву, свірны, некалькі дзясяткаў невялікіх хацін. У гонар караля Якава I, або Джэймса



Прыбыццё першых перасяленцаў у Паўночную Амерыку

*З дапамогай тэксту параграфа патлумачце змест ілюстрацыі. На якой падставе мог пачацца дадзены канфлікт?*



Сутычка перасяленцаў з індзейцамі

(англійскае вымаўленне імя Якаў), яны назвалі раку Джэймсам, а пабудаваны форт —Джэймстаўнам. Такім чынам паўстала першая англійская калонія на амерыканскай зямлі, якая атрымала назву Віргінія. Неўзабаве былі заснаваныя новыя англійскія калоніі ўздоўж берагавой лініі Атлантычнага акіяна. У 1700 г. у іх жыло каля 300 тыс. чалавек.

Хто ж яны былі, першыя каланісты-перасяленцы? У першую чаргу — пурытане, якіх праследавалі ўлады. У Амерыцы яны спадзяваліся знайсці свабоду веры. З'язджалі сяляне, якія страцілі свае зямельныя надзелы. Сярод іх было шмат маладых людзей. У Амерыку высылаліся таксама злачынцы, прыдатныя да працы. Тут яны маглі пачаць новае жыццё.

Перасяленцы сутыкнуліся з велізарнымі цяжкасцямі. Умовы жыцця тут былі складаныя. Краіна была багатая на прыродныя рэсурсы і ўрадлівыя землі, але працоўных рук катэгарычна не хапала. З'явіліся невядомыя і смяротна небяспечныя хваробы. Адбываліся сутыкненні з ваяўніча настроенымі індзейцамі. Каланісты ж сяліліся на іх землях, адбіралі іх паляўнічыя ўгоддзі. Еўрапейцаў і іх нашчадкаў чакала цяжкая і пакутлівая барацьба за выжыванне на велізарным і дзікім кантыненце.

175—178

*Паразважайце, якімі якасцямі характару мусілі валодаць першыя еўрапейскія перасяленцы ў Паўночнай Амерыцы. Патлумачце сваё меркаванне.*

Паступова каланісты прыстасоўваліся да мясцовых умоў. Яны пачалі вырошчваць тут тыя культуры, якія ў Еўропе складалі аснову іх харчавання: пшаніцу, жыта, авёс, боб, моркву і цыбулю, гадавалі свіней і буйну´юрагатую жывёлу. У індзейцаў навучыліся вырошчваць бульбу і кукурузу, выдзёўбваць чаўны з дрэва, рабіць лыжы.



Карэнныя амерыканцы. Мастак *Карл Бадмер.* 1844 г.

**2. Лёс індзейцаў.** Калі еўрапейцы ўпершыню прыбылі ў Амерыку, там жылі сотні розных індзейскіх плямёнаў. Укожнага племені былі свае звычаі, мова і заняткі. Індзейцы палявалі на дзікіх жывёл, збіралі плады і ягады ў лясах, лавілі рыбу і займаліся земляробствам. Прылады працы яны выраблялі пераважна з дрэва і каменю. Галоўнай зброяй былі лук і стрэлы. З'яўленне еўрапейцаў аказалася згубным для гэтых плямёнаў. Індзейцы паміралі ад хвароб (воспа, адзёр і інш.), невядомых да тых часоў у Амерыцы. Іх забівалі ў сутычках, а тых, хто застаўся жывы, выганялі з іх зямель. За кожнага забітага індзейца ў калоніях выплачвалася ад 50 да 100 фунтаў стэрлінгаў. Гэтай сумы было дастаткова для таго, каб набыць добры надзел зямлі. Да пачатку XX ст. большасць індзейцаў Паўночнай Амерыкі былі вынішчаныя. Каланісты апраўдвалі такія дзеянні сваімі рэлігійнымі перакананнямі. Яны лічылі індзейцаў «дзікімі жывёламі і неразумнымі істотамі», якіх не грэх забіваць.

**3. Паўднёвыя і паўночныя калоніі.** У сярэдзіне XVIII ст. у Паўночнай Амерыцы ўжо існавала 13 англійскіх калоній. Вярхоўная ўлада ў калоніях належала англійскаму каралю, і ўсе пасяленцы, незалежна ад нацыянальнасці, з'яўляліся падданымі брытанскай кароны.

Вялікую ролю ў каланізацыі Паўночнай Амерыкі адыгралі англійскія пурытане. Менавіта яны прывезлі з сабой на кантынент дэмакратычныя і рэспубліканскія ідэі. Міграцыя (перасяленне) з Англіі не перапыня-




Англійскія калоніі ў Паўночнай Амерыцы

лася. У сярэдзіне XVIII ст. да 90 % белых жыхароў калоній былі англічанамі.

Калі высветлілася, што жыццё ў калоніях можа прынесці дабрабыт і нават узбагачэнне, пачалося стыхійнае перасяленне з Еўропы. Сюды пацягнуліся немцы, французы, галандцы і датчане. У большасці гэта былі сяляне і рамеснікі. Але былі і дваране, якія пакінулі радзіму з палітычных меркаванняў. Каланісты належалі да розных плыней хрысціянства. Таму ад самага пачатку ім давялося развіваць у сабе такую важную якасць, як верацярпімасць.

*З дапамогай тэксту параграфа вызначце прычыны, якія змушалі еўрапейцаў выпраўляцца ў невядомыя землі Паўночнай Амерыкі.*



Сушэнне тытуню

*Які тып гаспадаркі паказаны на ілюстрацыі? Якія дэталі карціны дапамаглі вам гэта вызначыць?*

Эканамічнае развіццё калоній было неаднолькавым. У паўднёвых калоніях (Поўдзень) квітнела ***плантацыйная гаспадарка***. На велізарных участках зямлі—плантацыях—вырошчваліся тытунь, бавоўна, індыганосныя расліны (з іх здабывалі фарбавальнік індыга), рыс, якія карысталіся вялікім попытам у Англіі. Ад самага пачатку ў калоніях не хапала працоўнай сілы. Ганарлівыя і незалежныя індзейцы не жадалі адмаўляцца ад звыклага ладу жыцця і працаваць на белых. Яны аддавалі перавагу смерці перад няволяй. Выйсце было знойдзена: захопленых або выкупленых у Афрыцы рабоў пачалі тысячамі ўвозіць у Амерыку. Тут яны падвяргаліся жорсткай эксплуатацыі. Раба можна было набыць, прадаць або беспакарана забіць.

У паўночных калоніях (Поўнач) развівалася ***фермерская гаспадарка***. Працавітыя пасяленцы расчышчалі землі, будавалі дамы з бярвення і стваралі свае фермы (гаспадаркі). Фермеры жылі ў невялікіх паселішчах ці асобна на зямлі, якую апрацоўвалі. Уладальнікі фермаў самі забяспечвалі сябе ўсім неабходным. За карыстанне невялікімі зямельнымі надзеламі фермеры плацілі арэндную плату буйны́м землеўласнікам.

**4. Развіццё культуры.** Амерыканская нацыянальная культура —адна з самых маладых у свеце. Яе асновай стала англійская культура. Але ўнёсак у фарміраванне амерыканскай культуры зрабілі розныя народы. У ёй нямала запазычанняў з культуры індзейцаў і афрыканцаў, асабліва ў сферы музычнай і паэтычнай творчасці.

Вялікае значэнне ў калоніях надавалася адукацыі. Амаль ад самага пачатку каланізацыі ўводзілася ўсеагульнае пачатковае навучанне. Багатыя плантатары паўднёвых калоній, як правіла, наймалі прыватных выхавальнікаў, якія вучылі дзяцей пісьму, чытанню, арыфметыцы, лацінскай і грэчаскай мовам. Заможныя бацькі часта адпраўлялі сваіх сыноў ва ўніверсітэты Англіі. У Паўночнай Амерыцы да сярэдзіны XVIII ст. дзейнічала восем навучальных устаноў (каледжаў).

*Знайдзіце інфармацыю пра першую вышэйшую навучальную ўстанову, заснаваную ў Паўночнай Амерыцы. Прадстаўце яе аднакласнікам.*

Пісьменнасць сярод мужчынскай часткі белага насельніцтва калоній была амаль усеагульнай. Такія гарады, як Бостан, Філадэльфія і Нью-Ёрк, ператварыліся ў найбуйнейшыя культурныя цэнтры.

У амерыканцаў не было сваіх Ньютанаў, але работы некаторых навукоўцаў XVIII ст. атрымалі прызнанне ў Еўропе. Значнае месца сярод іх займае Бенджамін Франклін.

***Бенджамін Франклін*** (1706–1790) праславіўся адкрыццямі ў галіне электрычнасці і вынаходніцтвам маланкаадвода. З дапамогай звычайнага папяровага змея, якога хлапчукі запускаюць у неба, ён даказаў, што маланка ўяўляе сабой электрычны разрад.



Бенджамін Франклін.
Мастак *Жазеф Дзюплесі.*
Каля 1785 г.

*Высветліце, чым яшчэ знакаміты Бенджамін Франклін.*

У другой палове XVIII ст. шырокае распаўсюджанне ў Паўночнай Амерыцы атрымалі ідэі еўрапейскага Асветніцтва. Сярод адукаванай часткі насельніцтва вельмі папулярнымі былі погляды англійскага асветніка Джона Лока, які сцвярджаў, што галоўная задача дзяржавы — гэта ахова чалавечага жыцця, свабоды і маёмасці. Такое ўяўленне пра дзяржаву адпавядала поглядам усіх амерыканцаў.

*Такім чынам, еўрапейская каланізацыя Паўночнай Амерыкі непазнавальна змяніла аблічча гэтага аддаленага кантынента. Англійскія калоніі, што паўсталі на яго тэрыторыі, леглі ў аснову фарміравання амерыканскага народа і дзяржавы.*

***Ключавыя словы:*** *каланізацыя, індзейцы, плантацыйная гаспадарка, фермерская гаспадарка, Бенджамін Франклін.*

**Пытанні і заданні**

**1.** Калі і якім чынам распачалася еўрапейская каланізацыя Паўночнай Амерыкі? Якія пласты еўрапейскага насельніцтва складалі асноўную частку перасяленцаў на паўночнаамерыканскі кантынент?

**2.** Назавіце прычыны, па якіх большая частка індзейскага насельніцтва да пачатку XX ст. была вынішчаная.

**3.** Патлумачце, чаму ў Паўночнай Амерыцы пачаў развівацца гандаль рабамі. Каму ён прыносіў выгаду?

**4.** Назавіце асноўныя дасягненні амерыканскай культуры. У чым праявілася яе сувязь з еўрапейскай культурай?

**5.** Складзіце расказ пра сустрэчу еўрапейскіх перасяленцаў з індзейцамі з пункту гледжання: а) еўрапейскага перасяленца; б) карэннага жыхара.

**6.** Параўнайце плантацыйную і фермерскую гаспадаркі паводле наступнага плана: а) у якой частцы Паўночнай Амерыкі развіваліся; б) якія культуры вырошчваліся; в) чыя праца выкарыстоўвалася.